Зіновій Прыгодзіч

# СЯБРОЎСТВА ШЧЫРАГА ІМГНЕННІ

*Да 70-годдзя з дня нараджэння Міколы Мятліцкага*

## «ХРОСНЫ БАЦЬКА»

З Міколам Мятліцкім мы пазнаёміліся недзе ў канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Кажу «недзе», бо, дальбог, дакладную дату ўжо не магу прыгадаць. Ведаю толькі, што адбылося гэта на кватэры Барыса Сачанкі. Мікола працаваў тады рэдактарам у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Прадстаўляючы мяне, Барыс Іванавіч жартаўліва сказаў:

— Вось твой будучы аўтар. Глядзі ж, не крыўдзі яго...

Што адказаў Мікола, не згадаю, але запомніў яго ўважлівы, пранікліва-дапытлівы позірк. З таго часу пры сустрэчы мы цёпла віталіся, перакідваліся словам-другім і зноў на пэўны час разыходзіліся. Знаёмства не перарастала ў нешта большае. Гэтае «большае» — маецца на ўвазе сяброўства — пачалося тады, калі Мікола Міхайлавіч перайшоў на працу ў часопіс «Полымя», на пасаду галоўнага рэдактара.

Я зайшоў да яго, каб павіншаваць з новым, высокім прызначэннем. Мы разгаварыліся. Мікола з натхненнем стаў распавядаць пра план развіцця і абнаўлення старэйшага беларускага часопіса, а тады раптам прапанаваў:

— Ты павінен стаць нашым актыўным аўтарам. Калі што ёсць — прынось...

Я ўспомніў, што ў мяне недзе захоўваецца магнітафонны запіс выступлення Васіля Быкава ў Мінскай партыйнай школе, дзе я тады працаваў загадчыкам кафедры журналістыкі і літаратуры. Праслухаў я гэты запіс і зразумеў, што з яго можна зрабіць неблагую гутарку. Тое, што атрымалася, паказаў Міколу. Ён прачытаў і, ухвальна паклаўшы даланю на рукапіс, сказаў:

— Будзем друкаваць!

А праз некаторы час тэлефануе мне і просіць зайсці.

— Я тут падумаў... — сказаў ён, калі я пераступіў парог яго кабінета. — Чаму б табе не ўзяцца за цэлы цыкл такіх гутарак з вядомымі дзеячамі нацыянальнай культуры? У мяне нават і назва ўжо ёсць для такога цыкла — «Постаці».

Вось так з блаславення Міколы Мятліцкага «ўвязаўся» я ў няпростую і вельмі адказную працу, якой аддаў больш за дзесяць гадоў і ў выніку якой у «Полымі» было апублікавана каля дваццаці гутарак. Пазней яны склалі тры кнігі пад такой жа назваю — «Постаці».

З гэтай нагоды Мікола Міхайлавіч нават прысвяціў мне жартаўлівы верш:

Знайсці па духу родзіча
Ці з горада, ці з хутара,
Паклічце перш Прыгодзіча —
Адразу ўспыхне гутарка.
Сядзіць, удумна ўзрушаны,

Не з чаркаю налітаю —
Гаворыць так нязмушана
Ён з творчаю элітаю.
Прымкне, нібы на выгане
Бычка на кол вяроўкаю,
Патоў за сем ён выганіць
Спрактыкаванай лоўкасцю.
Сваёй жалезнай воляю
Так сціснe суразмоўніка —
Адрозніць той ці здолее
Прыметнік ад назоўніка.
І крокамі вясёлымі
Падальш ад рознай поскудзі
Нясе Зіновій ў «Полымя»
Эпохі новай постаці.

Так пачалося не толькі маё цеснае супрацоўніцтва з часопісам «Полымя», але і шчырае, шматгадовае сяброўства з яго галоўным рэдактарам. З таго часу я стаў Міколу Мятліцкага жартам і ўсур'ёз называць сваім «хросным бацькам».

## ПА КОЛАСАВЫХ МЯСЦІНАХ

Аднойчы Мікола тэлефануе мне і кажа:

— Міхась Канстанцінавіч просіць з'ездзіць яшчэ раз на Пухавіччыну. Хоча развітацца з памятнымі мясцінамі...

Патлумачу: Міхась Канстанцінавіч — гэта малодшы сын Якуба Коласа, доктар фізіка-матэматычных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР. Колькі год таму па ініцыятыве Міколы Міхайлавіча мы ўжо былі ў тых мясцінах на Пухавіччыне, дзе ў саракавых гадах мінулага стагоддзя летаваў з усім сваім сямействам Якуб Колас, а з 1960 па 1970 год адпачываў Міхась Канстанцінавіч, таксама разам з сям'ёю. Тады мы прайшлі левым берагам Свіслачы, улюбёнымі мясцінамі Коласа, наведалі знакаміты вусцянскі грудок, не раз апеты народным песняром у сваіх вершах. Адзін з такіх вершаў Мікола прачытаў на памяць, чым вельмі ўсцешыў Міхася Канстанцінавіча.

І вось пагодлівым жнівеньскім ранкам мы тым жа складам прыехалі сюды зноў. Толькі на гэты раз рашылі пабываць на другім беразе Свіслачы — у Беразянцы. Менавіта ў гэтай невялічкай лясной вёсачцы летаваў Якуб Колас і дзесяць гадоў запар адпачываў Міхась Канстанцінавіч.

Вядома ж, ад былой Беразянкі не засталося і следу. На месцы колішняй вёскі стаіць толькі помнік, на якім выбіты 43 прозвішчы. Гэтулькі жыхароў з дзевятнаццаці хат было спалена гітлераўцамі ў жніўні 1943 года. За тое, што на дарозе побач з вёскаю быў забіты партызанамі гітлераўскі паслугач, спаленыя жыўцом старыя і малыя. Малодшаму жыхару было два гадкі.

Пасля вайны дзесяць сядзіб былі адбудаваны, але з гадамі іх усё менела і менела, і на пачатку 1980-х не засталося ніводнай хаты. Вёска пайшла ў нябыт, у вечнасць...

Мы хадзілі тымі мясцінамі, дзе калісь віравала жыццё, чуўся смех, дзявочыя песні, мыканне кароў, кукарэканне пеўняў. Цяпер тут толькі самотна шапацелі здзічэлыя яблыні на колішніх сядзібах, буяў неўміручы бэз ды журботна пагой-



**У майстэрні народнага мастака Беларусі Івана Міско.**
**На здымку: Мікола Мятліцкі, Іван Міско, Міхась Міцкевіч і Зіновій Прыгодзіч.**

дваліся вершаліны выгоністых соснаў. А калісьці, па ўспамінах Міхася Канстанцінавіча, тут быў поплаў, шаўковая травіца, а на беразе Свіслачы — шыкоўныя пляжы з залаціста-белага пяску. Берагі сённяшняй ракі зараслі кустоўем, алешынамі, высокай, у рост чалавека, травой.

Журботна вільготніліся вочы Міхася Канстанцінавіча. Ён час ад часу адыходзіў ад нас убок і надоўга задумваўся аб нечым сваім. Мы ў такія хвіліны стараліся яго не турбаваць. Можа, гэта былі хвіліны спаткання са сваёй маладосцю, а можа, і развітання — як-ніяк чалавеку ішоў дзевяноста першы год. Ці прыедзе ён яшчэ калі сюды, дзе прайшлі яго лепшыя, самыя сонечныя дні?

Тым не менш, нягледзячы на ўзрост і хворыя ногі, Міхась Канстанцінавіч цэлых паўдня тупаў нароўні з намі — і праз лес да Свіслачы, і да мастка на Жалязянцы (колішняй меліярацыйнай канаве, дзе ў чысцюткай і цёплай вадзіцы купаліся ягоныя дзеці — Маша і Сяргей).

За тыя шэсць гадоў, што мы не бачыліся, Міхась Канстанцінавіч прыкметна здаў. Пацяжэў у хадзе, больш сумнымі сталі вочы, хаця яшчэ час ад часу, калі прыгадваў што-небудзь вясёлае, яны загараліся ранейшым бляскам і праменіліся чыстым і глыбокім блакітам. А вось памяць і цікавасць да навакольнага засталіся ранейшыя. Шмат расказваў на памяць сваіх і чужых эпіграм, без натугі называў дзясяткі прозвішчаў, лічбаў.

Падчас імправізаванага абеду, ля невялічкага цяпельца, Мікола вельмі гарача агітаваў Міхася Канстанцінавіча напісаць успаміны пра маці. А перад гэтым ён жа натхніў яго на кнігу «Апалены золак» — пра свайго сярэдняга брата Юрку, які загінуў у першыя месяцы вайны.

Але Міхась Канстанцінавіч, уздыхнуўшы, з прыкметным сумам сказаў:

— Не асілю ўжо... Наўрад ці ўдасца...

Праўда, крыху пазней, калі мы ўжо ехалі дадому, вярнуўся да гэтай прапановы і больш пэўна прамовіў:

— А я падумаю...

І такая задума была ажыццёўлена. Толькі не самім Міхасём Канстанцінавічам, а яго жонкай, Наталляй Іванаўнай, але, безумоўна, з самай актыўнай дапамогай мужа. Кніга называецца «Доўгая дарога ад дома Янкі Маўра да дома Якуба Коласа».

## АДЗІН ДЗЕНЬ У «ЗУБРОНКУ»

Пра «Зубронак» — нацыянальны адукацыйна-аздараўленчы цэнтр — ведаюць, бадай, усе. Гэта — наш беларускі «Артэк», дзе адпачыць любому школьніку лічыцца за гонар. А вось пра тое, што тут, у гэтым цэнтры, акрамя адпачынку і аздараўлення, ажыццяўляюцца яшчэ дзясяткі разнастайных культурна-асветніцкіх праграм, ведаюць далёка не ўсе.

Адна з такіх праграм — рэспубліканскі конкурс паэтычнага майстэрства. Калі дакладана казаць, то сам конкурс праводзіцца ў абласцях, а вось канчатковае падвядзенне яго вынікаў, вызначэнне пераможцаў ужо робіцца ў «Зубронку». Намінанты з усіх абласцей (а гэта звычайна каля дваццаці юнакоў і дзяўчат) прыязджаюць сюды на тыдзень, а то і больш. З імі сустракаюцца дасведчаныя ў літаратуры людзі, дэталёва разбіраюць іх творы, адбіраюць лепшае. І вось з гэтым лепшым юныя аматары паэтычнай творчасці выходзяць ужо на заключны этап — на разгляд журы.

Так сталася, што вясною 2010 года быць у складзе журы выпаў гонар і нам з Міколам Мятліцкім. Яго абралі старшынёю, мяне і мясцовага рэдактара раённай газеты, пісьменніка Паўла Жукава, — членамі журы.

Павінен сказаць, што гэта была не толькі ганаровая, але і вельмі напружаная, адказная праца. Напружаная, бо мы загадзя з творамі не знаёміліся. Кожны з дваццаці прысутных на паседжанні журы ўставаў і чытаў тры-пяць сваіх вершаў. І трэба было даць ім пэўную ацэнку.

Па праўдзе кажучы, вершы на слых я ўспрымаю кепска. Далёка не ўсё магу схапіць адразу. А вось Мікола здзівіў і ўразіў мяне па-сапраўднаму. Я ўпершыню адкрываў яго з гэтага боку. Ён не толькі глыбока ўнікаў у сэнс, ідэю твора, але і ўлоўліваў усе яго нюансы, дэталі. І не шкадаваў добрага слова, калі прыкмячаў трапны радок, цікавую метафару, свежую рыфму, надзвычай добразычліва растлумачваў той ці іншы недахоп.

Але, бадай, самае цікавае было тое, калі мы пасля шматгадзіннага паседжання журы сабраліся ў асобным пакоі для абмену думкамі і вызначэння пераможцаў. Тут Мікола Міхайлавіч зноў нямала здзівіў. Ён уважліва выслухоўваў нашы з Паўлам Сямёнавічам меркаванні і, калі быў з чым не згодны, горача ўступаў у спрэчку. І прыводзіў такія довады, аргументы, што не пагадзіцца з ім было цяжка. Як паэт, ён, бясспрэчна, усе тонкасці паэтычнага радка разумеў намнога глыбей. Мы ж звычайна ў сваіх меркаваннях кіраваліся першым, чыста знешнім, трохі павярхоўным уражаннем. Але ў рэшце рэшт знаходзілі, як цяпер кажуць, кансэнсус і прымалі ўзважанае, аб'ектыўнае рашэнне.

— Зразумейце... — даводзіў Мікола Міхайлавіч, — якую адказную ролю мы бярэм на сябе — вызначаем, па сутнасці, творчы лёс сённяшніх намінантаў. Таму памыляцца не можам ні ў якім разе.

А якую бліскучую прамову сказаў Мікола Міхайлавіч на заключным пасе-джанні журы, пасля таго, як пераможцам былі ўручаны заслужаныя ўзнагароды! Сёння, за даўнасцю часу, я ўжо не магу даслоўна ўзнавіць сказанае ім. Але агульны сэнс прамовы быў такі.

Напачатку Мікола Міхайлавіч падзяліўся ўражаннем ад знаёмства з творчасцю ўдзельнікаў конкурсу. Сказаў, што яно вельмі і вельмі неблагое. Былі творы слабейшыя, былі мацнейшыя, але былі творы. І яны даюць падставу спадзявацца, што іх аўтары, ва ўсякім разе некаторыя, з цягам часу і пры настойлівай працы могуць стаць сапраўднымі паэтамі. Параіў дзяўчатам і хлопцам не кідаць захаплення паэзіяй ні пры якіх абставінах, чым бы па жыцці не давялося займацца. Гэта надзвычай важна, бо паэзія абуджае ў чалавеку фантазію, развівае творчыя здольнасці, а ўсе гэтыя якасці патрэбны ў любой прафесіі.

Яшчэ раз нагадаў юным пачаткоўцам, што такое сапраўдная паэзія, што яна трымаецца на двух кітах — думцы і вобразах. І ў пацверджанне гэтага прачытаў на памяць дзясяткі вершаў беларускіх і рускіх класікаў.

Парадаваўся, што пераважная большасць агучаных тут твораў напісана па-беларуску і ў рэалістычным рэчышчы. Значыць, сённяшнюю творчую моладзь яшчэ не заразіў вірус постмадэрнізму, і перасцярог яе, каб яна, барані бог, не збілася на гэты разбуральны, тупіковы шлях.

## КАЛЯ ЦЯБЕ МНЕ ХОРАША

У апошнія гады наша сяброўства было асабліва цеснае і плённае. Але пры чым тут плён, калі сяброўства, як сцвярджаюць разумныя людзі, заўсёды павінна быць чыстае і бескарыслівае? А мне думаецца, што шчырае, высокае, сапраўднае сяброўства заключаецца не толькі ў тым, каб мець агульнасць поглядаў, еднасць душ, але і жаданне, імкненне падтрымліваць адзін аднаго, дапамагаць адзін аднаму.

І вось у гэтым сэнсе мне моцна пашанцавала. У асобе Міколы Мятліцкага я меў чалавека, да якога я мог у любы час прыйсці з любой сваёй радасцю альбо праблемай і заўсёды знаходзіў разуменне і падтрымку.

Два прыклады.

Я напісаў апавяданне аб тым, як паміж дваімі закаханымі разладзіліся адносіны і, каб суцішыць душэўную рану, хлопец прызначыў спатканне дзяўчыне-суседцы, якая яму трохі падабалася. Але, правёўшы з ёю цэлы вечар, хлопец адчуў такую прыкрасць, што яго душэўная рана засмылела яшчэ мацней.

Даў пачытаць апавяданне Міколу. Прысуд быў суровы. Псіхалагічны стан героя выпісаны недакладна, павярхоўна, прамалінейна. Патрэбен нейкі больш моцны ўчынак, які б працверазіў героя. А ён, бачыце, нават абняць, пацалаваць дзяўчыну не змог. Цяперашняя моладзь гэтаму не паверыць.

Вярнуўшы мне пакрэслены рукапіс, Мікола прыклаў да яго яшчэ і гумарыстычны верш:

Мой сябар даслаў мне аповед на суд:
Чытай, падкажы, ці ў парадку ўсё тут.
Герой яго твора — цыбаты Кастусь
На дзеўчыну Надзю злуецца чамусь.
Да іншага горнецца!.. З роспачы той

Ад крыўды памкнуўся душой да другой
І так салаўём перад Таняй пяе,
Што нават забыў і паціскаць яе,
І тут жа прыняўся штосілы ўздыхаць,
Што толькі ён Надзю і здатны кахаць.
Твой твор, як і ты, дружа мой, састарэў.
І дзе ён, сучаснай эпохі павеў?

Без сумнення, мне было крыху крыўдна. Але я разумеў, што мой сябра сказаў мне горкую праўду, жадаючы мне толькі дабра. Зрэшты, мне і самому канцоўка апавядання здавалася крыху штучнай, надуманай.

Праз нейкі час, карыстаючыся парадамі Міколы, я перарабіў апавяданне, і яно, на мой погляд, набыло большую псіхалагічную глыбіню і жыццёвую праўду.

І другі выпадак.

Неяк мы з Міколам разгаварыліся аб паэзіі, і я прызнаўся, што ў школьныя, і асабліва ў студэнцкія гады таксама пісаў вершы, нават сёе-тое трапляла ў друк. Мікола шчыра зацікавіўся гэтым і папрасіў, каб я сабраў напісанае і паказаў яму.

Я так і зрабіў.

Ад Міколы доўга не было ніякага адказу. А я не напамінаў яму, думаючы, што ён, шкадуючы мяне, не абвяшчае свайго прысуду.

І раптам тэлефонны званок, у выхадны дзень, у нядзелю:

— Дружа, ты можаш забегчы да мяне?

— А калі?

— Ды хоць сёння.

І якое ж было маё здзіўленне, калі Мікола сустрэў мяне на парозе сваёй кватэры з шырокай, радаснай усмешкай:

— А ты, аказваецца, вялікі падпольшчык... Маючы такія вершы — і маўчаў. Іх жа можна друкаваць у «Полымі». Дарэчы, што ты збіраешся з імі рабіць?

Я шчыра прызнаўся, што ніякіх намераў не маю і наогул сумняваюся, ці маюць яны правы на публікацыю.

— Дарэмна... — пахітаў галавою Мікола. — Дарэмна. Вядома, не ўсе вершы раўнацэнныя, але я тут лепшае адабраў і бачу, што можа атрымацца неблагая кніжка.

Забягаючы наперад, скажу: Мікола не толькі адабраў, але і адрэдагаваў гэтыя вершы. Больш за тое, напісаў пранікнёную, добразычлівую прадмову. Падахвочаны сваім сябрам, я аднёс рукапіс у выдавецтва. І кніга пад назваю «Кукавала зязюля» неўзабаве пабачыла свет.

І на заканчэнне хачу прывесці некалькі аўтографаў Міколы на падараваных мне кнігах, якія таксама пра многае скажуць.

На кнізе «Мой боль вырастае да зор...» (2016):

«Дарагому сябру майму Зіновію Прыгодзічу — ад былога падлётка палескіх балот, якому давялося іх страціць за калючым чарнобыльскім дротам. Няхай ніколі дротам падобным не абаўецца твая шчасце-доля, мой дарагі дружа!»

На кнізе «Прысутнасць» (2017):

«Табе, Зіновій Кірылавіч,
Дарую творчы плён.
Хай сэрца тваё добрае
Ён цешыць многа дзён!

Аб чалавечай сутнасці
Вядзе няспешны сказ,
І для зямной прысутнасці
Дасць дужасці не раз.
Жыві, твары так горача,
Як здатны ты адзін!
Каля цябе мне хораша
Пабыць і пяць хвілін.
У часу грозным поступе,
Дзе буры адгулі,
Сказаў ты ўсім: "Мы — постаці
На бацькаўскай зямлі!"».

На кнізе «Існасць» (2020):

«Мой дружа, засталіся мы ўдвух.
Яднае нас наш паляшуцкі дух.
У памяці сяброў жывыя лікі —
Хай як даўжэй ім да сябе нас клікаць».

На вялікі жаль, лікі сяброў-таварышаў, што пайшлі ў вечнасць, паклікалі Міколу Мятліцкага да сябе занадта рана. Але засталася яго багатая творчая спадчына, у якой ён застаўся жыць, кожным сваім радком заклікаючы нас «скарбы зямлі, што ў спадчыну дадзена, у сэрцы трымаць, як надзейную зброю», пакінуўшы свой натхнёны, палымяны запавет: «каб Беларусь пад небам была і сёння, і заўтра, і вечна...»